З каталіцкіх СМІ Беларусі (23)

Аўтар: Рэдакцыя
23.01.2022 00:00

Сёлета спаўняецца 500 гадоў з часу выдання Францішкам Скарынам “Малой падарожнай кніжыцы”. Надрукаваная ў 1522 годзе ў Вільні, яна стала, па сутнасці, першым малітоўнікам для вернікаў, выдадзеным на беларускай мове. З нагоды юбілею выдання ў Літве 2022 год абвешчаны Годам Францішка Скарыны.

Каб ушанаваць гэтую важную гістарычную падзею ў духоўна-рэлігійным жыцці, 20 студеня ў Мінску, Полацку, Вільні, Варшаве, Падуі і Празе адбудуцца ўрачыстыя цэлебрацыі св. Імшы.

Плануецца, што ў кожнай краіне літургію ўзначаляць высокія касцёльныя іерархі: у Празе – кардынал Дамінік Дука, у Варшаве – біскуп Міхал Яноха, дапаможны біскуп Варшаўскай архідыяцэзіі, у Вільні – біскуп Арунас Паняшкайціс, дапаможны біскуп Віленскай архідыяцэзіі. У Беларусі адпаведныя набажэнствы ўзначаляць арцыбіскуп Юзаф Станеўскі і біскуп Алег Буткевіч. †

Літургія св. Імшы зазвычай прызначана для дарослых удзельнікаў і не дазваляе малым дзецям зразумець усю яе значнасць. І тады паўстае практычнае пытанне: “Ці павінны бацькі браць з сабой на св. Імшу дзяцей?”. Рабіць гэта варта.

Можа, хтосьці лічыць, што, спрабуючы дапамагчы свайму дзіцяці па-сапраўднаму перажыць св. Імшу, ён сам сябе абдзяляе, бо не мае магчымасці глыбока, напоўніцу перажыць набажэнства. Але ж давесці вашых дзяцей да Бога – гэта і ёсць ваша бацькоўскае пакліканне! Бог паклікаў вас стаць бацькам ці маці гэтага дзіцяці. Памятайце таксама, што літургія – гэта супольная малітва, а не прыватная, а ваша дзіця – удзельнік супольнасці. Мэта вашай выхаваўчай дзейнасці – паказаць дзіцяці вартасць літургіі. Калі на нядзельнай св. Імшы дзіця будзе адчуваць любоў, то яно зробіць усё, каб заўсёды ў ёй удзельнічаць.

З каталіцкіх СМІ Беларусі (23)

Аўтар: Рэдакцыя
23.01.2022 00:00